***Дейнека Н.М.***

БГЭУ (Минск)

МІКОЛА ГУСОЎСКІ – РЭНЕСАНСАВЫ ГУМАНІСТ

Мікола Гусоўскі (каля 1480-1533) – сапраўдны волат эпохі гуманістычнага Адраджэння, альбо Рэнесансу, які найбольш поўна і ярка ўвасобіў духоўную веліч народа, яго розум і паэтычны геній.

Сучаснік Ф.Скарыны, рэнесансавы гуманіст Мікола Гусоўскі, увайшоў у гісторыю палітычнай і прававой думкі Беларусі як аўтар славутага паэтычнага твора "Песня пра зубра",якая была напісана па асабістай просьбе Папы Рымскага Льва Х.

Тэма Радзімы – цэнтральная ў «Песні пра зубра». Паэма, прасякнутая любоўю паэта да роднага краю, стала песняй яго сэрца, гімнам Бацькаўшчыне.

Своеасаблівай эмблемай Радзімы паэта – Вялікага Княства Літоўскага – і вобразам-сімвалам яго даўняй магутнасці ў творы з'яўляецца зубр. У вобразе зубра М. Гусоўскі паказаў беларускі народ. Нораў зубра – гэта адметны характар беларуса: моцны, непакорны, міралюбівы, спакойны, незвычайна добры. Разам з тым Гусоўскі папярэджвае, што мірны звер-волат можа зрабіцца небяспечным для сваіх карнікаў.

Прааналізаваўшы твор, можна выдзяліць яго асноўныя ідэі:

1. Ідэальнай палітычнай формай кіравання з'яўляецца манархія.

Ролю манарха ён бачыў не толькі ва ўсталяванні палітычнйя згоды унутры краіны і ахове яе межаў але і ў фундатарстве мастацтваў. У святле традыцый эпохі Адраджэння М. Гусоўскі свядома ідэалізуе мінулае, і таму вобраз князя Вітаўта, стаўшы ідэйным цэнтрам паэмы, з усёй паўнатой увасобіў рэнесансныя ўяўленні пра ідэал. У ім паэт выявіў сваё ўсведамленне ідэальнага дзяржаўцы. Для паэта Вітаўт найперш уладар з вялікім міжнародным аўтарытэтам. Ён валодаў неабмежаванай уладай. Паэт захапляецца мудрасцю, непадкупнасцю, справядлівасцю князя Вітаўта: «...крывадушнасць болей за ўсё не любіў і, як сведчаць паданні, клятваадступнікаў-сведак судзіў, як забойцаў». Вобраз Вітаўта кампазіцыйна ўпісваецца ў вобраз зубра. Калі зубр – уладар

пушчаў, то князь – магутны ўладар, паважаны ва ўсіх дзяржавах, які дыктаваў сваю волю нават магутнай і грознай Ардзе.

2. Праблема аб выратаванні хрысціянскай цывілізацыі.

Адмоўуна ставіўся Гусоўскі да Рэфармацыі. Ён лічыў, што пратэстанцкія ідэі садзейнічаюць расколу хрысціянскага свету, ўзнимаюць ў грамадстве хвалю нянавісці і тым самым разваюць сацыяльныя канфлікты і грамадзянскія войны. Гусоўскі абвінавачваў Лютэра і яго аднадумцаў у тым,што яны расхісталі старажытныя ўстоі хрысціянскай рэлігіі, імкнуліся скасаваць услед за духоўнай і савецкую ўладу.Перад вялікай пагрозай хрысціянскім народам з боку Асманскай імпервыі ідэалогія пратэстантызму раз’ядноўвае і паслабляе іх.

3.Ідэя аб захоўванні навакольнага асяроддзя.

Чалавек, на думку аўтара, павінен навучыцца жыць у гармоніі з прыродай. Для М. Гусоўскага прырода – усенародны здабытак, крыніца здароўя, радасці, «эліксір маладосці, бадзёрасці духу». Паэту належыць вялікая заслуга ў пастаноўцы праблемы аховы прыроды, беражлівага стаўлення да яе, рацыянальнага выкарыстання і памнажэння. Паэт ставіць чалавека і ўвесь жывы свет на адзіны узровень, бо, калі загінуць усе жывыя істоты, то панікне душа чалавека, і тады не дапамогуць людзям ні культура,ні адукацыя.

Такім чынам, Мікола Гусоўскі змог геніальна прадбачыть шматлікія балючыя праблемы наступных стагоддзяў,звязаныя з крызісам гуманістычнага светаўспрымання. Праз літаратурную спадчыну М. Гусоўскага лёс нібы паспрабаваў падкрэсліць даўнюю ісціну: жыццё мінучае, мастацтва вечнае. Тым з большым правам аб яго несмяротнай паэме мы можам сказаць на мове, якой у пісьмовым ужыт ку карыстаўся наш вялікі прашчур: «Scripta manent» – «Напісанае застаецца».